Бібліотэка АН БССР

СМЕРЦЬ НЯМЕЦКІМ АКУПАНТАМ | ПРАЧЫТАЙ І ПЕРАДАЙ ДРУГОМУ

№ 18 (658)

# ГОЛАС ПАРТЫЗАНА

Пятніца 30 Ліпеня 1943 года.

Орган Дамачавіцкага Райкома КП(б)Б

## БЛІЗІЦЦА ЧАС КАНЧАТКОВАГА ВЫГНАННЯ З НАШАЙ ЗЯМЛІ КРЫВАВЫХ АКУПАНТАЎ

## ЗАГАД

### Вярхоўнага Галоўнакамандуючага

ГЕНЕРАЛУ АРМІІ тав. РАКАССОЎСКАМУ ГЕНЕРАЛУ АРМІІ тав. ВАТУЦІНУ

ГЕНЕРАЛУ-ПАЛКОЎНІКУ тав. ПАПОВУ

Учора 23 ліпеня паспяховымі дзеяннямі нашых войск канчаткова ліквідавана ліпеньскае нямецкае наступленне з раёнаў на поўдзень Орла і паўночнее Белгарада ў напрамку Курска.

З Раніцы 5 ліпеня нямецка-фашысцкія войскі буйнымі сіламі танкаў і пяхоты, пры падтрымцы многакольскаснай авіяцыі, перайшлі ў наступленне на Орлоўска-Курскім і Белгарадска-Курскім напрамках.

Немцы кінулі ў наступленне супроць нашых войск свае галоўныя сілы, сасрэдаточаныя ў раёнах Орла і Белгарада.

Як гэта цяпер стала вядома, нямецкае камандванне ўвяло ў бой: на Орлоўска-Курскім напрамку—7 танкавых, 2 матарызаваных і 11 пяхотных дывізій і на Белгарадска-Курскім напрамку — 10 танкавых, адну матарызаваную і 7 пяхотных дывізій.

Такім чынам, усяго з боку ворага ў наступленні ўдзельнічала 17 танкавых, 3 матарызаваных, 18 пяхотных нямецкіх дывізій.

Сасрэдаточыў гэтыя сілы на вузкіх участках фронта, нямецкае камандванне разлічвала канцэнтраванымі ўдарамі з поўначы і поўдня ў агульным напрамку на Курск прарваць нашу абарону, акружыць і знішчыць нашы войскі, размешчаныя на дузе Курскага выступа.

Гэта новае нямецкае наступленне не застала нашы войскі ўраспло́х. Яны былі гатовы не толькі адбіць наступленне немцаў, але нанесці ім утныя контрудары.

Цаной вялікіх страт у жывой сіле і тэхніцы праціўніку ўдалося ледзь уклініцца ў нашу абарону на Орлоўска-Курскім напрамку на глыбіню да 9 км. і на Белгарадска-Курскім напрамку ад 15 да 35 кіламетраў. У жорсткіх баях нашы войскі зматалі і абяскровілі адборныя дывізіі немцаў і наследуючымі рашучымі контрударамі не толькі адкінулі ворага і поўнасцю устанавілі становішча, займаемае імі да 5 ліпеня, але і прарвалі абарону ворага, прасунуўшыся ў бок Орла ад 15 да 25 км.

Поўная ліквідацыя нямецкага наступлення паказала высокую баявую вывучку нашых войск, непрэўзойдзенную стойкасць і геройства байцоў і камандзіраў усіх родаў войск, у тым ліку артылерыстаў і мінамётчыкаў, танкістаў і лётчыкаў.

Такім чынам нямецкі план летняга наступлення трэба лічыць праваліўшымся, тым самым разблачана легенда аб тым, што немцы могуць летам заўсёды ўтрымліваць поспехі, а рускія знаходзяцца ў адступленні. У баях за ліквідацыю нямецкага наступлення выдзяліліся войскі: генерал-лейтэнанта Бухова, генерал-лейтэнанта Галякіна, генерал-лейтэнанта танкавых войск Родзіна, генерал-лейтэнанта Раманенко, генерал-лейтэнанта Калпакчы, генерал-лейтэнанта Чысцякова, генерал-лейтэнанта танкавых войск Какукова, генерал-лейтэнанта танкавых войск Ротмістрава, генерал-лейтэнанта Жадова, генерал-лейтэнанта Шумілова, генерал-лейтэнанта Крычэнкіна, лётчыкаў авіяцыйных злучэнняў генерал-палкоўніка авіяцыі Галаванава, генерал-лейтэнанта авіяцыі Красоўскага, генерал-лейтэнанта Рубінко, генерал-лейтэнанта авіяцыі Науменко.

За час баёў з 5 па 23 ліпеня вораг панёс наступныя страты: убіта салдат і афіцэраў—70 000, падбіта і знішчана танкаў — 2 900, самаходных гармат—195, гармат палявых—844, знішчана самалётаў—1392 і аўтамашын больш 5 000.

Віншую Вас і кіруемыя Вамі войскі з паспяховым завяршэннем ліквідацыі летняга нямецкага наступлення.

Абвяшчаю падзяку ўсім байцам, камандзірам і палітработнікам кіруемых Вамі войск за выдатныя баявыя дзеянні.

Вечная слава героям, паўшым на полі боя ў барацьбе за свабоду і чэсць нашай Радзімы.

**Вярхоўны галоўнакамандуючы**

**Маршал Совецкага Саюза І. СТАЛІН**

24 ЛІПЕНЯ 1943 ГОДА.

## З аперaтыўнай зводкі Совінфармбюро

На працягу 26 ліпеня нашы войскі на Орлоўскім напрамку працягвалі наступленне, прасунуўшысь уперад ад 5 да 10 км., занялі звыш 70 насел. пунктаў.

На Белгарадскім напрамку пошукі разведчыкаў і баі мясцовага характару.

За 25 ліпеня на ўсіх франтах падбіта і знішчана 52 нямецкіх танка, збіта 57 самалётаў ворага.

# СУРОВАЯ КАРА ЧАКАЕ ГІТЛЕРАЎСКІХ РАБАЎЛАСНІКАЎ І ЗАБОЙЦАЎ ЗА ІХ ЗЛАЧЫНСТВЫ

## Замест хлеба—кулю ў бандыцкае горла

Дарагія таварышы! Гітлераўскія дзікія орды наляцелі на наш край, крывёй залілі нашу зямлю.

Крыважэрныя фашысты застаўляюць Вас здаваць ім прадукты і ў той-жа час налётамі урываюцца ў вёскі і угапяюць вашу жывёлу, грабяць усе вашы здабыткі. Яны ўжо разінулі звярыную пасць на новы ўраджай. Перад сваей немінучай пагібеллю подлыя акупанты імкнуцца да шчэнту абрабаваць беларускі народ.

Не хлеба, а кулю ў ненасытнае бандыцкае горла!

Таварышы! Скрывайце ў лясах жывелу, закопвайце збожжа, хавайце яго так, каб непранюхала яго фашысцкая сабака.

## Жалкі „паход“ Фрыцаў

Нямецка-паліцэйская банда рашыла зрабіць грабежніцкі налёт на мірныя вёскі. Як драпежныя ваўкі яны агладаліся ва ўсе бакі дарогі, ведаючы, што немінуча іх чакае кара народных мсціўцаў.

Група падрыўнікаў з брыгады Ч. першай пачаставала свінцом гітлераўцаў. Фрыцы з боем увайшлі ў пустую вёску Б. жыхары угналі жывелу і самі ушлі у лес.

На подступах к другой вёсцы вораг сустрэў новае частаванне. Два аўтаматчыкі Міхаіл і Васілій доўга трымалі мерзаўцаў у баявым парадку, што дало магчымасць насельніцтву скрыцца ў лес.

Варваўшысь у вёску бандыты пачалі грабіць маёмасць сялян. Але тут новая бяда сустрэла немчураў. Група аўтаматчыкаў агнявым шквалам з левага фланга заставіла іх кідаць награбленае і прынімаць баявы парадак. З правага фланга падышлі другія групы партызанаў. У завязаўшымся баю немцы разгубіліся і пачалі ў паніцы бегчы, аставіўшы 4 трупы ўбітых. Вораг яшчэ не ўходзіць беспакарана. Група байцоў з атрада Нікіфара пад кіраўніцтвам комсамольца Л. мініруе шлях, дзе яшчэ 7 фрыцаў знайшлі сабе магілу.

Уперадзі яшчэ бяда... Партызаны абстралялі станцыю Н., у той час, як немцы прыбліжаліся да чыгункі. Мад'яры не пазналі сваіх гаспадароў і са станцыі адкрылі па іх моцны кулямётны і мінамётны агонь. І тут было забіта 10 фрыцаў.

К.

## Нямецкія Карабейнікі

За годы Сталінскіх пяцігодак у м. Азарычах былі пабудаваны вялікі райўнівермаг, сельмаг, 4 прадуктовых і 9 загатоўчых магазінаў. На сельсоветам раёна было 13 сельмагаў і 73 прадуктовых крам.

Совецкаму спажыўцу прадастаўляліся ўсе магчымасці свабодна купляць тавары першай неабходнасці.

Так было, калі на нашай зямлі быў гаспадаром Совецкі чалавек. А цяпер?

У мястэчку ўсё зруйнавана. Магазіны ператвораны ў мусарныя памяшканні.

Хвастлівых гітлераўскіх тавараў няма і ў паміне. Замест с о л і, хлеба немцы даюць народу кулю.

На вуліцах мястэчка блытаюць так званыя карабейнікі—нямецкія салдаты. Яны па пішчанскі прадаюць р у с к у ю соль, іголкі, нямецкую сахарыну, краску па куры, гусі яйкі. Гэтыя прадукты яны адсылаюць у галодную германію.

Сялянка Анна Б. была саслана ў концлагер за тое, што сказала: „у немцаў акрамя краскі, іголак і сахарыны нічога няма“. Другая жанчына Надзя была зверскі збіта гітлераўскім фетфебелем за тое, што не жадала даць 10 яйкаў за 1 іголку.

Валодзько.

## Радасныя весткі даходзяць да насельніцтва

Палітработнікі атрада Васіля праводзяць масава - растлумачальную работу сярод насельніцтва. Зачытваецца тэкст Загада Вярхоўнага галоўнакамандуючага таварыша Сталіна і зводкі Совінформбюро.

У с ю д ы н а с е л ь н і ц т в а радасна тым, што Чырвоная армія, разграміў адборныя гітлераўскія полчышчы ў раёнах Орла, Курска, Белгарада, перайшла ў наступленне

Наш народ прымае меры для самаабароны ад налётаў гітлераўскіх бандытаў. Організоўваюцца атрады для аховы вёсак. У вёсцы Т. ёсць т а к і а т р а д у колькасці 32 чалавекі.

С.

## Паляванне на фрыцаў

Група падрыўнікоў Ісака Н. наладжвае паляванне на гітлераўскіх акупантаў. Нядаўна байцы абстралялі поезд, ішоўшага на усходні фронт. Паравоз загарэўся і стаў.

Уладзімір.

### З А М Я Ж О Ц

## Ваенныя дзеянні ў Сіцыліі прышлі к завяршэнню

Войскі саюзнікаў занялі ўсю заходнюю частку острава, захапіўшы галоўны горад Сіцыліі — Палермо. Адсюль саюзнікі прасоўваюцца на ўсход.

Па апошнім даным, саюзнікі захапілі 45 000 палонных, апрача таго, у заходняй частцы острава яны акружылі 3 варожыя дывізіі.

***

Пасля таго, як саюзнікі занялі г. Палермо у гарадах Італіі узніклі многакалькасныя вулічныя дэманстрацыі. Па ўсёй краіне распаўсюджылася хваля забастовак. У Мілане адбыліся кровапралітныя сутычкі паміж італьянцамі і немцамі. Немцы стралялі у натоўп з гармат.

## АДСТАЎКа МУСАЛІНІ

Фашысцкі дыктатар Мусаліні ушоў ў адстаўку.

Адстаўка Мусаліні — гэта крах усяго італьянскага фашызма. Асноўнай прычынай гэтага з'яўляецца ваенная паражэнне Італіі. Яе войскі пацярпелі паражэнне спачатку ў Абісініі, затым на Совецка-германскім фронце (дзе была разгромлена адборная італьянская 8-ая армія), затым у Паўночнай Афрыцы і, нарэшце у апошнія дні н а о с т р а в е С і ц ы л і я!

Націск Чырвонай арміі на Совецка-германскім фронце прымусіў Гітлера адмовіць Мусаліні ў яго просьбе ў прысылцы дапамогі у Італію.

***

У апошні час Італьянскае агенства Сцефані паведаміла, што 27 ліпеня на першым паседжанні новага совета міністраў пад старшынством Бадальо было рашэно распусціць фашысцкую партыю.

Р э д к а л е г і я

У—40 Выданне Дамапавіцкага РК КП(б)Б Зак. 15